
У межах краязнаўчага асветніцкага біябібліяграфічнага праекта «Славутыя імёны маёй малой Радзімы» бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтаваны біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» пад назвай «Па працы і пашана»

.

Зберажэнне гістарычнай памяці, веданне сваёй духоўнай спадчыны вяртаюць нас да памяці аб тых, хто праславіў родную зямлю сваімі справамі, сваёй добрасумленнай працай. Іх жыццёвы шлях, адданасць справе выклікаюць бясконцую павагу і заслугоўваюць асаблівай падзякі землякоў. Лёсы іх розныя, не падобныя адзін на аднаго, але іх аб'ядноўвае вынік дзейнасці на карысць развіцця нашай малой радзімы. Біябібліяграфічны даведнік «Па працы і пашана» з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» прысвечаны асобам, якія ўдастоены высокага звання «Герой Сацыялістычнай Працы», узнагароджаны дзяржаўнымі працоўнымі ўзнагародамі, удастоены звання «Заслужаны работнік» у розных галінах дзейнасці. Можна сказаць, што ў нейкім сэнсе даведнік - гэта кніга працоўнай славы нашых землякоў.
Матэрыял выдання згрупаваны ў наступныя раздзелы: Героі Сацыялістычнай Працы; Ардэнаносцы; Заслужаныя работнікі Беларускай ССР, Рэспублікі Беларусь; Заслужаныя работнікі-землякі іншых дзяржаў; Лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі; Даведачна-дапаможны апарат.
Артыкулы ў кожным раздзеле размешчаны ў алфавіце прозвішчаў асоб. Біяграфічныя даведкі напісаны на аснове фонду Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, архіўных дакументаў, аўтабіяграфій, успамінаў і іншых крыніц. Тэкст дапоўнены фотапартрэтамі. Размяшчэнне бібліяграфічных запісаў унутры раздзелаў - алфавітнае (для кніг, артыкулаў з даведачных выданняў, зборнікаў); храналагічнае (для газетных і часопісных артыкулаў), у межах года - у зваротнай храналогіі публікацый. Прадстаўлены бібліяграфічныя выданні цэнтральнай раённай бібліятэкі, найбольш значныя электронныя рэсурсы. Адбор крыніц завершаны ў студзені 2020 года.
Даведачна-дапаможны апарат выдання ўключае імянны, геаграфічны паказальнікі; алфавітны спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў выданне.
Біябібліяграфічны даведнік уключае звесткі пра 362 землякоў, узнагароджаных дзяржаўнымі працоўнымі ўзнагародамі, удастоеных звання «Заслужаны работнік» у многіх прафесіях. Прызначаны шырокаму колу карыстальнікаў: настаўнікам, студэнтам, навучэнцам, бібліятэкарам, краязнаўцам, экскурсаводам, наогул усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, дасягненнямі людзей, якія ўнеслі асабісты ўклад у развіццё нашай малой радзімы. Асаблівую актуальнасць даведніку надае той факт, што ён выдадзены ў Год малой радзімы ў Беларусі.


Па працы
і пашан
біябібліяграфічны дав

Па працы і пашана

біябібліяграфічны даведнік

«Імёны на карце Кобрыншчыны

